УДК 947.6

**В.А. Шэйфер**

# Маскоўска-літоўскія ўзаемаадносіны і вайна 1500–1503 гг.

На працягу амаль шасці гадоў пасля заканчэння першай маскоўска-літоўскай вайны 1492–1494 гг. Масква і Вільня вялі паміж сабой складаную дыпламатычную гульню, у якой ставілі розныя мэты. Вялікі князь літоўскі Аляксандр, нягледзячы на страты вялікіх тэрыторый, імкнуўся захаваць трывалы мір на сваіх усходніх межах, а вялікі князь маскоўскі Іван III рыхтаваўся да новага ўзброенага сутыкнення з Літвой, даследаваў намеры праціўніка і шукаў саюзнікаў. Калі ён пераканаўся, што ВКЛ не рыхтуе рэваншу, то ацаніў гэта як праяву слабасці і прыспешыў пачатак вайны.

Апошняй спробай вырашыць канфлікт мірным шляхам было гаспадарскае пасольства на чале са смаленскім намеснікам маршалкам Станіславам Петрашковічам Кішкам і пісарам Ф. Рыгоравічам, якое прыбыло ў Маскву 23 красавіка 1500 г. Вялікі князь Аляксандр згаджаўся прызнаць за Іванам III тытул «гасудара ўсяе Русі» пры ўмове, што той выдасць С. Бельскага і іншых перабежчыкаў. Ён даводзіў, што не трэба верыць Бельскаму, які гаворыць пра прыцясненні праваслаўных і Алены Іванаўны ў ВКЛ [1]. Пасольства не дасягнула сваіх мэт, наадварот, паказала слабасць ВКЛ, асабліва запозненае і безвыніковае прызнанне Іванавага тытула, і гэта ў той час, калі на маскоўскі бок пачала пераходзіць новая «партыя» памежных князёў.

Адказы Івана III можна расцаніць як абгрунтаванне аб'яўлення вайны, якая і пачалася праз некалькі тыдняў. У сапраўднасці мір быў парушаны яшчэ ў 1499 г., калі маскоўскія войскі занялі тарапецкае памежжа на 10 вёрст углыб ВКЛ. Уступка ў справе тытула цяпер не мела для Масквы практычнага значэння. Іван III ужо не мог адмовіцца ад вайны ў такіх спрыяльных умовах, калі на яго баку быў Менглі-Гірэй, у Казані сядзеў яго стаўленік Абдул-Лаціф. Чэшскаму каралю Уладзіславу Казіміравічу і Яну Альбрэхту пагражала Турцыя, так што яны не маглі ў бліжэйшы час аказаць дапамогу свайму брату Аляксандру. Пасля заняцця дацкім каралём Іаанам шведскага трона магчымасць выступлення Швецыі на баку саюзнага ВКЛ Лівонскага ордэна была выключана. Аляксандр мог разлічваць толькі на дапамогу Вялікай Арды, якая была блізкай да распаду, і Лівонскага ордэна.

У Вільню быў накіраваны «складны ліст», але яшчэ раней, 3 мая, з Масквы на Бранск выступіў з войскам ваявода Якаў Захар'ін «воровскім обычаем». Афіцыйнай прычынай вайны быў аб'яўлены ўціск праваслаўных у ВКЛ і прымус Алены Іванаўны да каталіцтва. На самай справе Іван III пачаў вайну, па трапным вызначэнні «Хронікі Быхаўца», «болшого расширения панства своего прагнучи» [2].

Умоўна тэатр ваенных дзеянняў можна падзяліць на Северскі, Тарапецкі, Смаленскі франты. Найперш на Севершчыну ўступілі войскі Я. Захар'іна. Не-

бяспечнай з'явай для ВКЛ аказаліся дамовы Івана III з князямі Шамяцічам, Мажайскім і Бельскім, пра якія вялікі князь літоўскі своечасова не даведаўся. Гэта дало магчымасць маскоўскім войскам заняць тэрыторыю Чарнігава-Старадубскага (валоданне Мажайскага) і Ноўгарад-Северскага (валоданне Шамяціча) княстваў хутчэй, чым у ВКЛ паспелі зарыентавацца. Войскі Я. Захар'іна ўзялі Бранск, прывялі да прысягі землі Шамяціча, 6 жніўня ўзялі Пуціўль, потым – Мцэнск, Сярпейск, Старадуб, Гомель, Любеч, Ноўгарад-Северскі, Рыльск. Менавіта тады на бок Масквы перайшлі Трубяцкія і Масальскія. За адну выправу амаль без супраціўлення былі занятыя тэрыторыі паўднёвай часткі Смаленскай зямлі з гарадамі Бранскам, Трубчэўскам і Масальскам і ўся тэрыторыя двух вышэйпамянёных княстваў. Заняўшы Гомель, маскоўскія войскі ўшчыльную падышлі да Дняпра, што непасрэдна пагражала Чарнігаву і Кіеву.

Аднак гэтыя далучэнні не былі такімі бесканфліктнымі, як лічылася раней у гістарыяграфіі. Даследаванне А.В. Русінай лёсу пуціўльскіх баяр паказвае, што многія перайшлі на маскоўскую службу толькі пад прымусам (напрыклад, баярын Сянько Жэрэбяціч доўга сядзеў у вязніцы, пакуль згадзіўся на службу маскоўскаму валадару, падобным быў лёс пуціўльскага намесніка Багдана Глінскага). Тым, хто застаўся верным, даваліся валоданні ў глыбі ВКЛ да вызвалення тэрыторыі ад ворага. М.М. Кром, прасачыўшы лёсы чарнігаўскіх баяр, склаў табліцу, з якой вынікае, што пасля 1500 г. на літоўскай службе засталіся больш за 40 прадстаўнікоў чарнігаўскіх родаў, у той час як на маскоўскую перайшлі (у тым ліку і ў наступныя гады) каля 15.

Другая групоўка маскоўскіх войскаў, на чале з Ю. Захар'іным, накіравалася пад Смаленск і Дарагабуж. З гэтага часу і да 1514 г. (моманту ўзяцця смаленскага замка маскоўскімі войскамі) смаленскі напрамак стаў галоўным у маскоўскім наступе. Для абароны Смаленска Аляксандр Казіміравіч паслаў атрад гетмана К.І. Астрожскага, які ў канцы чэрвеня прыкладна з 3500 вершнікамі падышоў да горада, дзе прастаяўшы тыдзень, далучыў да сябе некалькі тысячވояў намесніка С. Кішкі і рушыў далей да Дарагабужа. Каб з'явіцца перад ворагам нечакана, войскі збочылі з дарогі і прайшлі 2 мілі праз густы лес і балота. 14 ліпеня, трохі не дайшоўшы да р. Ведраш, даведаліся, што перад імі стаіць вялікае маскоўскае войска. Па звестках «Хронікі Быхаўца», войска ВКЛ налічвала 3,5 тыс., маскоўскага войска – 40 тыс. [2, с. 154]. М. Стрыйкоўскі падае падобныя ж суадносіны сіл [3]. Сучасныя расійскія гісторыкі К.В. Базілевіч і Ю.Г. Аляксееў лічаць, што суадносіны былі роўныя. Беларускі даследчык Г.М. Сагановіч падае іншую прапорцыю: 40 тыс. – 4 тыс. Зыходзячы з вышэйпададзеных, найбольш верагоднай здаецца наступная лічба войскаў ВКЛ: больш за 3,5 тыс. (pulczwarta – аналогія лічбе, якая ўзгадваецца ў беларускіх летапісах: «полчетыре» – 3,5) войскаў К. Астрожскага плюс, магчыма, смаленскія войскі (калі яны не ўвайшлі ў лічбу, прыведзеную ў крыніцах) і 40 тыс. маскоўскіх (у чым зыходзіцца большасць крыніц і аўтараў). Зыход бітвы вырашыў абыходны манеўр маскоўскага атрада, які спаліў мост на шляху магчымага адыходу ліцвінаў і напаў з тылу. Апынуўшыся ў акружэнні, нешматлікія харугвы Астрожскага былі разбітыя. У палон трапілі: сам гетман і ягоныя ваяводы: Р. Осцік, маршалак Ян Літавор Храбтовіч, М. Глябовіч, М. Зяноўевіч і інш. [2, с. 155]. Фактычна, большая частка войска ВКЛ была вынішчана, амаль усё камандаванне ўзята ў палон. Аднак, за 200 км ад Смаленска знаходзілася другое войска на чале з вялікім князем, таму нельга казаць пра поўнае вынішчэнне ваеннага патэнцыялу ВКЛ. Бітва з'явілася знакавай у гэтай вайне, хоць мела больш маральнае і палітычнае значэнне, чым стратэгічнае. Маскоўскія войскі ўсё ж не ўзялі

Смаленск. Яны таксама панеслі значныя страты. На гэта ўказвае іх просьба аб прысылцы падмацавання.

Трэцяя групоўка маскоўскіх войскаў была сабраная ля Вялікіх Лукаў. Яе рух на поўдзень з захопам Тарапца, выхадам на Заходнюю Дзвіну ствараў пагрозу з тылу ўсяму Смаленскаму рэгіёну, а таксама асноўным палітычным цэнтрам ВКЛ, бо тут быў сканцэнтраваны вузел дарог да Полацка і Смаленска. Пра самыя дзеянні гэтай групоўкі мала вядома. Хутчэй за ўсё яна была накіравана пад Дарагабуж, як і рэзерв з Цверы.

Пасля перамогі на р. Ведрашы маскоўскія войскі ўзялі Пуціўль, Дарагабуж, Тарапец, Залідаў [2, с. 155]. Каб дасягнуць поўнага поспеху, Іван III намаўляў Менглі-Гірэя ўдарыць па лініі: Слуцк – Тураў – Пінск – Менск. Восенню 15 тыс. крымчакоў зрабілі набег на паўднёвыя раёны ВКЛ і Польшчы. Аднак гэта не дало Івану III рэальнай дапамогі ў яго запланаваным паходзе на Смаленск, хоць Вялікаму княству і Кароне быў нанесены значны ўрон. Татары бесперашкодна парабавалі Падолле, Валынь, Галіччыну, асобныя загоны даходзілі да Любліна і Віслы. Былі спалены таксама прадмесці Бярэсця і Камянца.

Такім чынам, маскоўскі бок хоць і меў значныя ваенныя поспехі, але свае планы рэалізаваў не цалкам. У той жа час Аляксандр Казіміравіч рабіў захады, каб нейтралізаваць Менглі-Гірэя і ўстанавіць з ім добрыя адносіны. Летам 1500 г. у Крым быў накіраваны талмач Берандзей, які перасцерагаў хана ад саюзу з Іванам III: «А он што и братьи своей рожонай поделал, также через присягу... их смертью ўморил, и иным суседом своим то завсегда он чинит». Дзеля прымірэння Аляксандр гатовы быў адмовіцца ад сяброўства з Вялікай Ардой, аднак спроба ўсталявання крымска-літоўскага саюзу аказалася няўдалай. Нічога не дало і пасрэдніцтва малдаўскага гаспадара Стэфана, які «ахаладзеў» да Масквы ў сувязі з адхіленнем ад трона яго ўнука Дзмітрыя Іванавіча (сына Івана Іванавіча «Меншага» і яго дачкі Алены-«валашанкі»). Сам Стэфан пачаў хіліцца да міру з Ягелонамі, бо спадзяваўся на вызваленне з іх дапамогай ад туркаў.

Летам 1500 г. Аляксандр яшчэ не траціў надзеі ўрэгуляваць спрэчкі дыпламатычным шляхам. У ліпені ў Маскву прыбыў гаспадарскі ганец Мацей Кунцавіч, які прасіў выдаць «апас» для паслоў. Іван III задаволіў гэтую просьбу, аднак толькі ў канцы года ў Маскву выбраліся велікакняжацкі пасол Ст. Нарбут і польскі А. Скарута. Пасольства не мела поспехаў, як і наступнае ў студзені 1501 г. – місія Мацея Чажаліцкага, спецыяльнага прадстаўніка чэшскага і венгерскага караля Уладзіслава, нягледзячы на тое, што Ягелоны пагражалі Івану III вайной з Чэхіяй, Венгрыяй, Польшчай і ВКЛ адначасова. Магчыма, ён ужо настолькі быў упэўнены ў сваёй моцы, што рызыкнуў супрацьпаставіць сябе ўсім Ягелонам, пагрозам якіх меў падставы не давяраць. У канцы 1500 г. узнавілася перапіска Я. Забярэзінскага і Я. Захар'іна.

Няўдача перагавораў пераканала Аляксандра Казіміравіча, што страчаныя тэрыторыі можна вярнуць толькі сілай. Вясной 1501 г. ён заручыўся падтрымкай даўніх саюзнікаў, з якімі вёў перагаворы яшчэ з пачатку вайны – хана Заволжскай Арды Шых-Ахмата і магістра Лівонскага ордэна Вальтэра фон Плетэнберга (вайна Ордэна з Масквой цягнулася з 1501 па 1503 г.). Можна сказаць, што іх выступленні часова скавалі сілы Івана III і Менглі-Гірэя. Іван III, заняты барацьбой яшчэ і з нагайскімі і заволжскімі татарамі, якія пагражалі Казані, вымушаны быў адкласці паход на Смаленск. Менглі-Гірэй, заняты змаганнем з Шых-Ахматам, не мог здзейсніць рэйды на ВКЛ. Аднак у 1501 г. актыўныя ваенныя дзеянні вялі толькі Плетэнберг і Шых-Ахмат.

Аляксандр Казіміравіч, атрымаўшы звесткі, што 17 чэрвеня 1501 г. у Торуні памёр ягоны брат Ян Альбрэхт, накіраваўся ў Польшчу. 19 жніўня ён быў абраны польскім каралём. Адсутнасць манарха і спадзяванні на хуткую дапамогу

палякаў сталі прычынай пасіўнасці войскаў ВКЛ у другой палове 1501 г. Адначасова з падпісаннем у 1501 г. Мельніцкага акта была ўзноўлена унія паміж Каронай Польскай і ВКЛ. Польскі гісторык Ян Натансон-Лескі слушна падкрэсліваў, што абранне Аляксандра польскім каралём адразу адбілася на супрацьстаянні Вільні і Масквы. Новаабраны кароль павінен быў заняцца польскімі справамі. Рэальнай жа дапамогі ад Польшчы ВКЛ так і не атрымала. Пасланы польскі атрад не дайшоў да тэатра ваенных дзеянняў. З боку Аляксандра гэта была здрада саюзнікам. Магістр Плетэнберг не змог узяць Ізборск, Івангарад, Пскоў, хоць для таго меліся рэальныя магчымасці. Сюды, на злучэнне з ім павінны былі ісці літоўскія войскі пана Чарняка (Яна Чорнага, ці Чорнага чэха), але яны не паспелі. 24 лістапада 1501 г. лівонскія войскі былі разбітыя пад Гельмедам Д. Шчэнем. Магчыма, тады была страчана рэальная магчымасць нанесці адчувальнае ваеннае паражэнне Маскоўскай дзяржаве і перапыніць яе экспансію, тым больш што войскі Шых-Ахмата пачалі займаць Севершчыну, а пры дапамозе ВКЛ лівонцы маглі б дасягнуць значных поспехаў на Пскоўшчыне. Маскве цяжка было б змагацца на тры франты, калі б саюзнікі дзейнічалі разам, тым больш, што адзін з іх – Вялікая Арда – нейтралізоўваў важнага маскоўскага саюзніка – Крымскае ханства, а тылам Івана III пачалі пагражаць і нагайцы.

На самым літоўска-маскоўскім фронце ў 1501 г. адбываліся ў асноўным лакальныя сутычкі. Выключэннем можна назваць толькі бітву пад Мсціславам. Ягоны замак ляжаў паміж Смаленскам і Севершчынай і, натуральна, меў важнае стратэгічнае значэнне для абодвух бакоў. 4 лістапада маскоўскія войскі на чале з В. Шамяцічам і С. Мажайскім, ваяводамі А.В. Растоўскім, С.І. Варанцовым і інш. са Старадуба падышлі пад Мсціслаў, дзе разбілі палкі чаркаскага старасты А. Дашковіча і князя М. Іжаслаўскага, якія ледзьве паспелі схавацца за сцены. Аднак Мсціслаў не быў узяты маскоўскімі войскамі, разгарнуць наступленне ў гэтым напрамку ім не ўдалося, бо на іх шляху сталі літоўскія войскі на чале з гетманам найвышэйшым Ст. Кішкам.

На лета 1502 г. Іванам III быў задуманы паход на Смаленск. 14 ліпеня маскоўскія войскі на чале з яго сынам Дзмітрыем Жылкам і ваяводамі Д. Холмскім і Я. Захар'іным выступілі пад Смаленск і аблажылі яго. Гэта была першая аблога смаленскай крэпасці маскоўскімі войскамі. Яна зацягнулася і скончылася няўдала, «понеже град крепок бе». 23 кастрычніка войска вярнулася ў Маскву. Была і яшчэ адна прычына, па якой яны адступілі. «Хроніка Быхаўца» паведамляе, што ў 1500 г. «Аляксандр Казіміравіч паслаў у Карону Польскую, у Чэхію і ў Нямеччыну ганцоў і наняў за грошы колькі тысяч вояў. Тады прыйшоў да яго ў Літву адзін чэх Ян Гірнін (Карамзін называе яго Чорным чэхам. – В.Ш.), а з ім шмат чэхаў, немцаў ды палякаў». Менавіта яны былі ўведзены ў дзеянне тады пад Смаленскам паралельна з уласным войскам ВКЛ. З гэтых часоў у ВКЛ пачалі выкарыстоўвацца наёмныя войскі. М.К. Любаўскі лічыў, што ў 1502 г. яны былі авангардам войска і больш баяздольнымі, чым земскае (шляхецкае) апалчэнне. Аднак ім прыходзілася шмат плаціць. Па яго падліках, пры наступніку Аляксандра Жыгімонце на 1507–1508 гг. утрымлівалася 500 жаўнераў, падчас вайны 1512–1522 гг. – каля 5000. Выдаткі на іх утрыманне былі вялікія. Аднак, карысць ад наймітаў у 1502 г. атрымалася невялікая. Відаць, не маючы дастаткова грошай для аплаты іх паслуг, Аляксандр распусціў гэтыя войскі, якія на зваротным шляху займаліся рабаўніцтвам [4]. У XVI ст. асновай войскаў ва ўсёй Еўропе стала прафесійнае наёмнае войска. ВКЛ жа не мела сродкаў на яго ўтрыманне, а паспалітае рушэнне паказала сваю небаяздольнасць у сутыкненнях з маскоўскімі ратнікамі.

13 верасня 1502 г. лівонцы ў Пскоўскай зямлі пад возерам Смолінскім разбілі маскоўскія войскі. Магчыма, паміж гэтай падзеяй і зняццем аблогі са Смаленска таксама ёсць сувязь. Акрамя таго, Іван III павінен быў заняцца ўпарадкаваннем занятых зямель, аб чым паведамляў і Менглі-Гірэю: адныя гарады былі адбудаваныя, у другія заселены людзі з цэнтральных раёнаў Маскоўскай дзяржавы, пастаўлены маскоўскія намеснікі.

Пасля аблогі Смаленска маскоўскія войскі занялі і спалілі Оршу, разрабавалі мсціслаўскія валасці і землі на Віцебшчыне і Полаччыне. У канцы 1502 г. у Ржэве, Ноўгарадзе і Северскай зямлі сабраліся тры вялікія групоўкі войскаў, якія зноў хадзілі «воевати литовскую землю». Падрабязнасці невядомыя, але ў лютым 1503 г. Іван III паведамляў Менглі-Гірэю пра іх поспехі.

Аблога Смаленска, хоць і няўдалая, ужо сама па сабе была грозным сігналам для ВКЛ. Наймацнейшая крэпасць на шляху да Вільні перад вайной ляжала ўглыбі краіны, цяпер жа стала памежным горадам. Ад маскоўскай жа мяжы Смаленск цяпер знаходзіўся на адлегласці 40–50 км, што тады для войска складала 4–5 дзён дарогі.

Не пакінулі ў спакоі ВКЛ і крымчакі. У жніўні 1502 г., падчас выправы маскоўскіх войскаў пад Смаленск, 9 тыс. (па звестках Менглі-Гірэя) крымчакоў на чале з сынамі хана Біціс-Гірэем і Бурнашам уварваліся ў паўднёвыя землі ВКЛ. За Уруч'ем яны разбілі невялікі аб'яднаны атрад князёў Хведара Пінскага, Юрыя Дубравіцкага і Рыгора Глінскага. Пераправіўшыся праз Прыпяць, татары імклівым маршам выйшлі да Слуцка, сталі кошам і распусцілі загоны пад Клецк, Нясвіж, Навагрaдак, Ішкальдзь. Учыніўшы шматлікія шкоды і захапіўшы вялікі палон, яны бесперашкодна вярнуліся ў Крым. Тады ж спыніла існаванне Вялікая Арда, разбітая Менглі-Гірэем. Ахмат знайшоў «прытулак» у ВКЛ. Крымскае ханства амаль бесперашкодна стала панаваць у стэпах. Супрацьвага яму была знішчана, і часткова па віне Аляксандра, які не выступіў разам са сваім саюзнікам у 1501 г.

Падзеі лета – восені 1502 г. паказалі, што абодва бакі ўжо вычарпалі сілы і не мелі магчымасцей для працягу вайны. Мірныя захады пачаліся яшчэ ў жніўні 1502 г. У Маскву да Баярскай рады прыбыло пасольства Паноў рады ВКЛ і польскай Каралеўскай рады. Аднак яны не ўлічылі асаблівасці ўнутранага ўладкавання Маскоўскай дзяржавы, дзе Баярская дума не мела такіх паўнамоцтваў, як Каралеўская і Велікакняжацкая рады. Перагаворы не атрымаліся. Тады пасрэднікамі выступілі Папа Рымскі Аляксандр VI і чэшскі і венгерскі кароль Уладзіслаў. Нарэшце, у студзені 1503 г. падчас візіту ў Маскву венгерскага пасла Жыгімонта Сантая была дасягнута дамоўленасць пра пачатак мірных перагавораў. 4 сакавіка 1503 г. у Маскву прыбыло сумеснае літоўска-польскае пасольства ў складзе ленчыцкага ваяводы П. Мышкоўскага, маршалка і полацкага намесніка Ст. Глябовіча, ковеньскага намесніка П. Яновіча, каралеўскага падчашага П. Врацімоўскага, пісара і канцлера, намесніка браслаўскага і познаньскага, каноніка Ст. Гарэцкага. «Пасольскі наказ» прадугледжваў: 1) не прызнаваць тытул «гасудар усяе Русі»; 2) не прымаць абвінавачванняў у тым, што ў Вільні не збудавана праваслаўная царква для Алены Іванаўны, бо такой дамовы не было; 3) адвяргаць сцвярджэнне пра рэлігійную нецярпімасць у ВКЛ – маскоўскі ўладар не можа ўмешвацца ў справы ВКЛ; 4) скаргі на наводы крымчакоў на ВКЛ; 5) патрабаваць, каб Іван III не прымаў перабежчыкаў, дамагацца міру на ўмовах трактата 1494 г. і вяртання захопленых пасля яго тэрыторый [5].

Перагаворы пачаліся 10 сакавіка і цягнуліся больш за 3 тыдні. Козырам гаспадарскіх паслоў былі лісты Алены Іванаўны, у якіх яна абвінавачвала бацьку ў развязванні вайны і прасіла аддаць захопленыя гарады (у тым ліку і наданы ёй у ВКЛ у 1501 г. замак Папова Гара). Вялікая княгіня пісала, што

«ад веку ніхто не чуў, каб бацька ваяваў з дзецьмі». Маці ж яе, якая знаходзілася пры смерці, упрасіла Івана III пайсці на некаторыя ўступкі. Гэта, як лічыць польскі гісторык Э. Рудскі, палегчыла паразуменне. Але бакі так і не прыйшлі да ўзаемапрымальных умоў. Масква не згаджалася на ўмовы 1494 г., спасылаючыся на тое, што «то ся ўж минуло». Абвінавацiўшы Аляксандра ў парушэнні мірнай дамовы, Іван III упершыню ў гісторыі двухбаковых адносін запатрабаваў усёй «рускай зямлі». Толькі дзякуючы пасрэдніцтву Ж. Сантая 20 сакавіка маскоўскі ўладар згадзіўся на заключэнне пераміp'я тэрмінам на 6 гадоў: ад Дабравешчання 1503 г. (7011) да Дабравешчання 1509 г. (7017). Бакі дамовіліся, што будуць весці перагаворы аб «вечным міры»; прадугледжваўся свабодны праезд і гандаль купцоў, а таксама абмен пасольствамі [6]. У перамірным лісце, ад 26–28 сакавіка, Іван III саступаў 6 з 25 валасцей, запатрабаваных літоўскімі пасламі. У цэлым, па падліках М.К. Любаўскага, ВКЛ пасля гэтай вайны страціла 19 гарадоў, 70 валасцей. На карысць Маскоўскай дзяржавы яно ўступіла рэшткі вярхоўскіх княстваў (Мцэнск, Сярпейск, Масальск, Любуцк), Чарнігава-Северскую зямлю з Чарнігавам, Старадубам, Рыльскам, Ноўгарад-Северскім, Гомелем, Почапам, Трубчэўскам, Радагошчам, Бранскам, часткай Кіеўскай (Пуціўль і Любеч), значную частку Смаленскай і Віцебскай зямель з Дарагабужам, Белай і Тарапцом, Мсціслаўскай (Хоцімль, Папова Гара, Мглін), паўночна-ўсходнюю частку Полацкай зямлі (Астры, Невель), а «вязни, на р. Ведроше поиманые, при Москве зостали» [6, с. 101].

У выніку вайны 1500–1503 гг. Маскоўская дзяржава выйшла да Дняпра ў раёне Любеча і Гомеля, што ставіла пад яе кантроль значны адрэзак дарогі на Кіеў. Кантроль над Дняпром меў важнае значэнне. Гэтая рака злучала два важнейшыя культурныя асяродкі ВКЛ: паўночны з цэнтрам у Вільні і паўднёвы з цэнтрам у Кіеве. Цяпер дарога адчынялася на Кіеў, Віцебск, Полацк і Смаленск. Апошні і стаў аб'ектам няспынных маскоўскіх паходаў. Адначасова ВКЛ траціла і прэстыж у рэгіёне, а Масква ўзмацнялася. Цяпер мяжа ўжо праходзіла прыкладна за 300 км ад Масквы (для параўнання: перад першай вайной – за 150 км), а Полацк, Віцебск, Смаленск, Кіеў апынуліся на адлегласці ў 50–100 км ад маскоўскай мяжы. Наступствам войнаў для ўнутранага становішча ВКЛ было палітычнае збліжэнне з Польшчай, у прыватнасці, Мельніцкая унія 1501 г., па якой абедзве дзяржавы павінны былі практычна зліцца ў адну. Гэта ішло насуперак інтарэсам літоўскіх магнатаў, у выніку унія не была імі ратыфікавана і так і засталася на паперы. Яна літаральна паўтарала акт 1401 г. і ўзнікла ў падобных умовах: і тая, і другая былі падпісаны пад пагрозай знешняй небяспекі – Віленска-Радамская 1401 г. пасля паражэння Вітаўта на р. Ворскле, а Мельніцкая – пасля паражэння войскаў ВКЛ на р. Ведрашы. Пасля абодвух Вільня была вымушана прасіць дапамогі ў Кракава. Рэальнай жа дапамогі ВКЛ так і не атрымала, наадварот, праз адцягненне ўвагі манарха на польскія справы, у самы адказны час літоўскія войскі былі бяздзейснымі.

У вайне 1500–1503 гг. ВКЛ панесла найвялікшыя страты ў супрацьстаянні з Маскоўскай дзяржавай. Страты ВКЛ дасягнулі крытычнага пункта (каля трэці тэрыторыі). Фактычна, больш сур'ёзных набыткаў ва ўсіх войнах гэтага перыяду (акрамя Смаленска) Масква не мела. Аднак гэтыя землі былі аддаленыя ад Вільні і цяжкія для абароны, іх князі не маглі атрымаць рэальнай дапамогі з цэнтру, што і стала адной з прычын іх пераходаў на маскоўскі бок. Пазней тэмпы прасоўвання маскоўскіх войскаў запаволіліся, бо яны сустрэліся з лепш арганізаваным адпорам. Агульная схема літоўска-маскоўскіх адносін не змянілася, вайна скончылася часовым пераміp'ем, наперадзе былі далейшыя маскоўскія наступы, а таксама спробы рэваншу з боку ВКЛ.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Литовская метрика***. Книга записей 10 (1440–1523). – Vilnius, 1996. – С. 154.
2. ***Хроніка Быхаўца*** // Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старарус., старабел. і польск. – Мн., 1997. – С. 99.
3. ***Stryjkowski M.*** Kronika Polska, Litewska, Zmudska i wszystkiej Rusi. – Warszawa, 1846. – T. II. – S. 310.
4. ***Хроника Литовская и Жмойтская*** // ПСРЛ. – М., 1975. – Т. 32. – С. 103.
5. ***Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею***. – СПб., 1846. – Т. 1 (1340–1506). – С. 347–350; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. КМФ 18. – Воп. 1. – Адз. зах. 6 (Літоўская метрыка. Кніга запісаў 6 (1495–1505). – 293 арк. (691 кадр).
6. ***Сборник Императорского Русского Исторического Общества***. – Т. 35: Памятники дипломатических отношений Московского государства с Польско-Литовским. – Т. 1 (1487–1503) / Под ред. ***Г.Ф. Карпова***. – СПб., 1882. – С. 401–402.



## SUMMARY

*Muscovian-Lithuanian relations in 1500–1503 came to war and then to peace negotiations. During this period the Great Principality of Lithuania lost about 1/3 of its area. These were the most important losses in Moscow-Lithuanian wars. But the struggle was not stopped.*



*Поступила в редакцию 6.10.2005*